— Што Іван робіць?
— Косы клепіць...
— ...Нашто яму сена?
— Кароў карміць.
— Нашто яму каровы?
— Малако збіраць.
— Нашто яму малако?
— Дзяцей карміць...

Д.д. ўваходзілі ў калядныя песні, гучалі на ўсіх этапах вясельнага абраду — ад сватання да пярэзваў. Калі адбываўся торг касы нявесты, сват маладога звяртаўся да брата маладой: «Чаго тутайка сеў?.. — Бо мне Бог так даў. Я сваю сястронку выгадаваў, як кветку ў садочку, а вы, напаснікі... хочаце ад мяне маю сястронку ўкрасці, то я мушу пільнаваці... — Ага! То ты за стоража сеў за сталом! — Не, я ў свайго ойца ў хаці і за ўласным сталом і кала свае роднае сястронкі... — Но, то чаго ж ты хочаш, чаго ж ты тутака ўсеўся? — То як жэ ж? Баба качаргу прадала і то тры дні мела за што піць, а я гэтакую сястронку выгадаваў, то такжа будзь ты, сватко, таго пэўны, жэ задарма не аддам...» (запіс М.Федароўскага). Жартоўны характар дыялогу не зніжаў яго ролі ў вясельным рытуале. Д.д. ажыўляюць сюжэтныя канфліктныя калізіі ў нар. празаічных і інш. творах. Фалькл. традыцыі Д.д. шырока выкарыстоўваліся ў інтэрмедыях школьнага тэатра, батлейкавых прадстаўленнях, сцэнах нар. драмы.

*Літ.*: Барышаў Г.І., Саннікаў А.К. Беларускі народны тэатр батлейка. Мн., 1962; Народны тэатр. Мн., 1983.

*А. С. Фядосік.*

**ДРО́БЫШ** Станіслаў Іосіфавіч (н. 17.3.1939, в. Заграддзе Слуцкага р-на), харавы дырыжор, педагог. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1975). Скончыў Бел. кансерваторыю (1972). З 1977 выкладае ў Бел. універсітэце культуры і мастацтваў (з 1981 загадчык кафедры, з 1994 прафесар). Адначасова ў 1964—93 кіраўнік Мінскага нар. хору Палаца культуры вытворчага будаўнічамантажнага аб'яднання «Мінскпрамбуд», арганізатар і кіраўнік *Мінскага фальклорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Валачобнікі»*. Аўтар музычных канцэртных і тэматычных праграм. Беражліва ставіцца да нар. песні, імкнецца да захавання яе ў блізкім да аўтэнтычнага варыянце.

*Г. Дз. Маторная.*

**ДРОЗД**. Меладычны спеў пеўчага або чорнага Д., які часам параўноўваюць з салаўіным, знайшоў адлюстраванне ў некаторых прыказках і прымаўках, напрыклад, «Не чапурыся, качачка: ні салавейкам, ні дроздзікам не станеш», «пець дразда» (г.зн. плакаць; з адценнем насмешкі). Д. вельмі дасканала будуе сваё гняздо, што таксама было заўважана: «Кожнаму дразду жаль па сваім гнязду», «Што дразду па чужому гнязду» (у пераносным сэнсе — пра чалавека, які дбае пра сябе і мала спагадвае іншым). Па тым, на якім месцы дрэва спявае ўвесну Д. (знізу, пасярэдзіне або на вершалінах елак), беларусы на Смаленшчыне меркавалі пра восеньскія цэны на хлеб — нізкія, сярэднія ці высокія, калі «і сам запяеш ты, і сам заскуголіш ты жалосна, як дрозд той». Адзначана таксама метэаралагічная прыкмета, што Д. ўвечары спяваюць на дождж (Воранаўскі раён). Шырока пашыраны ва ўсходніх славян казачны сюжэт «Ліса і дрозд (салавей)», у бел. казачнай традыцыі вядомы як «Лісіца і дрозд» (казка запісана Е.Раманавым ў Сенненскім павеце): ліса кожны раз падманвае Д., ён яе корміць і поіць, а затым па яе згодзе яшчэ і смяшыць: садзіцца бабе, якая разам з дзедам малоціць гарох, на галаву; дзед, палюючы на птушку, б'е цэпам бабу па галаве; такім чынам, замест птушкі церпіць чалавек.

*Літ.*: Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі. Мн., 1971; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996. С. 125—126, 209; Гура А.В. Символика животных в славянской народной традиции. М., 1997. С. 644—645.

*М. П. Антропаў.*

**ДРУ́ГАСНЫ ФАЛЬКЛО́Р**, форма ўзнаўлення фальклору ў мастацкай практыцы; адзін з тыпаў *фальклярызму* ў мастацкай творчасці. Фальклярызм — з'ява складаная. Адносіны да яго навукоўцаў і практыкаў збірання і вывучэння фальклору розныя. Адны бачаць у фальклярызме вульгарызацыю вуснапаэтычнай нар. творчасці, другія — спосаб захавання і распаўсюджання ў грамадстве духоўнай спадчыны народа, крыніцу эстэтычнай асалоды, наданне нац. каларыту творам мастацкай культуры. Фальклор і фальклярызм як з'явы культуры дапаўняюць адзін аднаго. Фальклярызм мае прыкметы творчых дасягненняў у апрацоўках нар.

песень, выкарыстанні фальклору, яго сюжэтаў, матываў, спецыфічных меладый, найгрышаў, інтанацый у творчасці кампазітараў, асобных выканаўцаў і калектываў. На практыцы фальклорам, з аднаго боку, лічаць апрацоўкі, стылізацыі, у т.л. Д.ф. З другога боку, на вусна-паэтычныя творы пераносяць законы прафесійнага мастацтва, падмяняючы адзін другім. Супрацьпастаўленне фальклору і фальклярызму адбываецца не на карысць творам вусна-паэтычнай нар. творчасці, іх аўтэнтычных форм і выканання. Вызначальная асаблівасць Д.ф. ў тым, што яго выканаўцы — не носьбіты традыцый. Звычайна гэта людзі, якія неабыякава ставяцца да лёсу нар. традыцыйнай спадчыны. Яны хочуць выконваць фалькл. творы на сцэне так, як яны бытуюць у натуральным асяроддзі. У калектывы Д.ф. ўваходзяць настаўнікі і ўрачы, работнікі культуры, рабочыя, студэнты, вучні і інш. Гэтыя калектывы ўзнікаюць у гарадах, дзе частка моладзі імкнецца вывучаць традыцыйную культуру, адчувае неабходнасць выпрацоўкі імунітэту супраць уздзеяння не лепшых узораў сучаснай попкультуры.

*Літ.*: Аляхновіч А.М. Народная песня ў мастацкай самадзейнасці. Мн., 1991. С. 43—44, 79—80, 94—96; Яго ж. Беларуская традыцыйная спадчына. Мн., 2000. С. 20—27, 373—379.

*А. М. Аляхновіч.*

**ДРУГІ**, парадкавы лічэбнік, які знаходзіцца ў апазіцыі да парадкавага лічэбніка *першы*. У традыцыйнай культуры і фальклоры беларусаў першы заўсёды мае статус сакральна-магічнага пачатку, які мадэліруе або праграміруе далейшае разгортванне падзей. Ён амаль заўсёды выступае ў апазіцыі да першага і пазначаны супрацьлеглым знакам, мае пераважна негатыўнае адценне або адзнаку. Другім актам Боскага тварэння было «стварэнне» Евы, жанчыны, за якой затым замацавалася характарыстыка грэшніцы, што спакусіла Адама. З таго часу кожная справа, якая мела сімвалічна-знакавае значэнне (надзелена статусам выключнасці), пры выпадку (неабходнасці) распачынання набывала адмоўнае адценне. У гаспадарчай дзейнасці лічылася, што багаты ўраджай будзе ў таго гаспадара, які першым пачаў сяўбу, другому ж у гэты дзень (ці адначасова) лепш не распачынаць справу, таму што не пашанцуе. З гэтай самай нагоды не распачыналі другую новабудоўлю ў адзін дзень у адной вёсцы. Пазней узнікла забарона адначасова вянчаць дзве пары, таму што тая пара, якую святар будзе вянчаць другой, акажацца нешчаслівай. Пры нараджэнні двойні людзі былі перакананы, што той, хто нарадзіўся першым, будзе дужым і шчаслівым, а хто другім — хваравітым і нешчаслівым. Падчас прыгатавання каляднай куцці і выпякання вясельнага каравая нельга было даставаць іх і глядзець, ці гатовы, а затым другі раз садзіць у печ. Калі жанчына выходзіла замуж другі раз, то не мела права апранаць на сябе звычайнае (белае) убранне нявесты. У чарадзейных казках герой змагаецца з чортам або змеем. Ён можа перамагчы праціўніка толькі тады, калі здольны збіць усе галовы адным махам; калі ж яму спатрэбіцца нанесці другі удар, то праціўнік становіцца ўдвая дужэйшым. Лічыцца, калі чалавек, які адправіўся ў дарогу, вымушаны вярнуцца назад і потым зноў у гэты ж дзень пакідае родную хату, то яму не пашанцуе. Сімвалізацыя другога пазначана адмоўнымі рысамі таму, што парадкавы лічэбнік Д. — гэта цень ад першага, але які не паўтарае канфігурацыю першага, а трансфармуе яе такім чынам, што Дабро ператвараецца ў Зло. Нельга дзіця другі раз прыкладваць да грудзей, калі ўжо зрабілі спробу адняць, у такім выпадку дзіця можа стаць сурочлівым. Д. з'яўляецца своеасаблівым медыятарам наміж светам жывых і «светам» памерлых. Нябожчыка абавязкова абмывалі другі раз. Існавала павер'е, калі ў адзін год у вёсцы паміраў другі чалавек, то неўзабаве трэба было чакаць смерці трэцяга.

*І. І. Крук.*

**ДРУЖКІ**, тое, што *бальшанкі*.

**ДРЫНЕЎСКІ** Міхаіл Паўлавіч (н. 12.2. 1942, в. Тонеж Лельчыцкага р-на), харавы дырыжор. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1978). Народны артыст Беларусі (1987). Прафесар (1992). Дзяржаўная прэмія Беларусі 1982. Скончыў Бел. кансерваторыю (1968), выкладае ў ёй. З 1968 хормайстар, з 1975 мастацкі кіраўнік *Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь* імя Г.І.Цітовіча. З 1954 працаваў таксама з самадзейнымі харамі: в. Прыбыткі Гомельскага, в. Тонеж, в. Букча Лельчыцкага раёнаў са